**ВОДЗЫЎ**

афіцыйнага апанента

доктара гістарычных навук

прафесара Ходзіна Сяргея Мікалаевіча

на дысертацыю Даніловіча

Вячаслава Віктаравіча

"Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)"

**Адпаведнасць дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі**

Выкананая Вячаславам Віктаравічам Даніловічам дысертацыя з'яўляецца самастойнай кваліфікаванай навуковай работай, якая ўтрымлівае новыя абгрунтаваныя вывады. Змест работы В.В. Даніловіча "Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)" адпавядае спецыяльнасці "07. 00. 02 – айчынная гісторыя". Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі, яе высновам і палажэнням, якія выносяцца на абарону.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

У айчыннай гісторыі 20–30-я гг. XX ст.з'яўляюцца найважнейшым пераходным перыядам, які змяніў усе бакі жыцця грамадства і дзяржавы. Гэта час кардынальных сацыяльна-эканамічных трансфармацый, узаемаўплыву старога і новага. Час, калі былі закладзены асновы савецкай мадэлі развіцця. Характэрнай асаблівасцю даследуемага перыяду была стаўка на маладое пакаленне, якое павінна было стаць лакаматывам пераўтварэння грамадства. Патрэба ў развіцці гістарычнай свядомасці падмацоўваецца неабходнасцю ўважлівага вывучэння падзей 20–30-х гг. XX ст. на аснове метадалагічнага плюралізму, а таксама новага пласту крыніц, якія заставаліся за межамі разгляду. Выхад на арэну грамадскага і палітычнага жыцця краіны як мінімум двух пострэвалюцыйных

пакаленняў моладзі, якія актыўна заявілі аб сваіх правах і інтарэсах, не толькі прыўнёс у працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця міжваеннага перыяду істотны дынамізм, але і спарадзіў цэлы спектр супярэчнасцяў.

У айчыннай гістарыяграфіі шмат публікацый, прысвечаных прадстаўленай праблематыцы, але да сённешняга дня адсутнічаюць грунтоўныя абагульняючыя дысертацыйныя працы. Неабходна больш глыбокае фундаментальнае вывучэнне тэмы дзейнасці моладзі, якая і ў часы савецкай улады, і сёння ў немалой ступені вызначае палітычны вектар развіцця беларускай дзяржаўнасці. Бо сутнасцю працэсаў мадэрнізацыі з'яўляецца фарміраванне новага чалавека, адпаведнага новаму тыпу грамадства. Пры гэтым найважнейшае значэнне для захавання стабільнасці развіцця грамадства мае праблема пераемнасці пакаленняў, захавання і прымнажэння традыцый ва ўмовах хуткіх змяненняў ў свеце.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыя з'яўляецца першым у гістарычнай навуцы самастойным комплексным даследаваннем, у якім на падставе сістэмнага вывучэння шырокага кола літаратуры і крыніц выяўлены сутнасць і змест, вызначаны перыяды, кірункі і формы ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі на працягу 1921–1939 гг.

Праведзенае на аснове апошніх дасягненняў гістарычнай навукі даследаванне дазволіла адлюстраваць асаблівасці нацыянальнага маладзёжнага руху, выявіць характэрныя рысы ўдзелу камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзяржаўных органах і Саветах і ўвогуле ў грамадска-палітычным жыцці; раскрыць ролю камсамола і несаюзнай моладзі ў станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі; вызначыць этапы дзейнасці маладога пакалення ў нацыянальна-культурнай сферы; адлюстраваць удзел камсамола і несаюзнай моладзі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем краіны.

У дысертацыі вызначана, што мадэрнізацыйныя працэсы, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг., стваралі аб'ектыўныя ўмовы для заснавання ў гэты час нацыянальных арганізацый моладзі. Устаноўлена спецыфіка сацыяльнага і колькаснага складу такога кшталту арганізацый, асноўныя формы іх дзейнасці (правядзенне вечарын, сходаў, акцый).

Упершыню на падставе шматлікага фактычнага матэрыялу адлюстравана што камсамол, які з самага пачатку ствараўся на інтэрнацыянальнай аснове і пад кантролем партыі, шырока выкарыстоўваўся партыйнымі структурамі для барацьбы з бюракратызмам і палітычнымі апанентамі (атрады "лёгкай кавалерыі" і інш.). Разам з тым, узмацненне ўнутрыпартыйнай барацьбы і спробы пашырэння кантролю над камсамолам Беларусі прыводзілі да ўмяшання цэнтральных органаў кіраўніцтва камсамолам і выклікалі крызісныя з'явы ў развіцці маладзёжнага саюзу, а таксама памяншэнне колькасці членаў ЛКСМБ. Вызначана, што дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх органаў павялічваўся інтарэс юнакоў і дзяўчат да грамадскіх аб'яднанняў, імкнення да ўступлення ў камсамол, што садзейнічала сацыялізацыі маладога пакалення.

У дысертацыі пераканаўча даказана, што дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх органаў ствараліся перадумовы для забеспячэння шырокай сацыяльнай падтрымкі ўлады, павелічэння колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання, уключэння ў разнастайныя формы культурнага будаўніцтва. Важным дасягненнем даследавання з'яўляецца вызначэнне характэрных асаблівасцей і абгрунтаванне перыядаў станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі, ідэйна-палітычнай асветы моладзі і ўдзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

У дысертацыі абгрунтавана, што важнай заканамернасцю будаўніцтва Савецкай Беларусі і перадумовай забеспячэння шырокай сацыяльнай падтрымкі ўлады з'яўлялася павелічэнне колькасці моладзі ў

органах дзяржаўнага кіравання, пашырэнне яе сацыяльна-эканамічных правоў.

Упершыню на матэрыяле развіцця Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. даказана, што ў дзейнасці камсамола адлюстраваліся ўсе супярэчнасці грамадска палітычнага жыцця краіны: рэалізацыя нацыянальнай палітыкі, калектывізацыі, антырэлігійнай прапаганды.

Высокая ступень навуковай навізны палажэнняў дысертацыі, якія выносяцца на абарону, і яе вынікаў даюць магчымасць зрабіць выснову аб тым, што па сваёй сутнасці выкананая работа з'яўляецца інавацыйнай, яе вынікі паспрыяюць далейшаму развіццю беларускай гістарычнай навукі.

**Абгрунтаванасць і даставернасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных ў дысертацыі**

Дысертацыя В.В. Даніловіча – першая выніковая спроба комплекснага і ўсебаковага даследавання маладзёжнага руху. Яна ахоплівае ўсе бакі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця краіны міжваеннага перыяду і заснавана на праведзеным навукоўцам скрупулёзным аналізе найшырэйшага кола крыніц, перш за ўсё архіўных, адзін пералік якіх займае некалькі старонак. У дысертацыі абгрунтаванасць і дакладнасць аўтарскіх вывадаў і рэкамендацый забяспечана, па-першае, з дапамогай аналізу і сінтэзу інфармацыйнага патэнцыялу архіўных і апублікаваных крыніц, а таксама шляхам выяўлення сувязі прадмета даследавання з іншымі аб'ектамі гістарычнай рэчаіснасці, у прыватнасці, з развіццём прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сферы адукацыі і навукі Савецкай Беларусі. Па-другое, паўната і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных ў дысертацыі, грунтуецца на доказнасці палажэнняў, якія вынесены на абарону, што дасягалася шляхам іх супастаўлення і параўнання з гістарыяграфічнымі напрацоўкамі, якія былі зроблены беларускімі і замежнымі даследчыкамі.

**Навуковая, практычная і сацыяльна-эканамічная значымасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі абумоўлена тым, што дысертант Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы комплексна, глыбока і грунтоўна раскрыў працэс удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі у складанейшы перыяд дзяржаўнага будаўніцтва 1921–1939 гг.

Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца для далейшай распрацоўкі праблем развіцця беларускай дзяржаўнасці, грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных адносін у гісторыі Беларусі. Прыведзеныя ў дысертацыі вывады важныя для тэарэтычнага асэнсавання ролі моладзі ў гэтых працэсах. Атрыманыя дысертантам вынікі маюць практычнае значэнне для распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржавы, могуць быць запатрабаваны органамі ўлады і кіравання ў працэсе далейшага ўдасканалення маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Вывады і канкрэтны факталагічны матэрыял праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі падручнікаў, вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў і навучэнцаў, пры распрацоўцы і ўдасканаленні курсаў, спецкурсаў і факультатываў па гісторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці, маладзёжнага руху, а таксама дысцыплін спецыялізацыі. Вынікі даследавання з’яўляюцца істотнымі для знаёмства шырокай грамадскасці з гісторыяй маладзёжнага руху ў Беларусі.

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе вядучых вну Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Сацыяльная значымасць вынікаў дысертацыі заключаецца ў тым, што гэтыя вынікі маюць патэнцыял перспектыўнага выкарыстання ў мэтах захавання сацыяльнай стабільнасці і забеспячэння прагрэсу дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Асноўныя вынікі даследавання апублікаваны ў 55 навуковых працах, выкананых аўтарам самастойна, у тым ліку ў манаграфіі (56,6 аўт. л.) і 25 артыкулах у навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (18,9 аўт. л.); 7 замежных навуковых выданнях (5,6 аўт. л.); а таксама ў 1 раздзеле калектыўнай манаграфіі (2,2 аўт. л.), 10 артыкулах у іншых навуковых выданнях (7,5 аўт. л.) і 18 публікацыях матэрыялаў навуковых канферэнцый (10,5 аўт. л.). Усе публікацыі выкананы аўтарам самастойна.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь.**

Структура і аб'ём дысертацыі адпавядаюць нарматыўным патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 глаў, якія ахопліваюць 14 раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі ахоплівае 298 старонак: тэкставая частка займае 229 старонак, спіс выкарыстаных крыніц – 40, дадаткі – 29 старонак. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 847 пазіцый, з якіх 792 складаюць крыніцы, 55 – публікацыі саіскальніка. Дысертацыя і аўтарэферат напісаны на беларускай мове і іх афармленне адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Аналіз дысертацыі і навуковых публікацый В.В. Даніловіча, метадалогіі, крыніцазнаўчай базы даследвання, ступені навуковай навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону, а таксама абгрунтаванасці і даставернасці вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных ў дысертацыі, іх практычнай, эканамічнай і сацыяльнай значымасці дае магчымасць зрабіць выснову, што дадзеная

работа з'яўляецца самастойна выкананым даследаваннем, аўтар якога праявіў высокі прафесіяналізм, прадэманстраваў здольнасць да вырашэння складаных і важных для развіцця беларускай гістарычнай навукі праблем, што адпавядае навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.

**Заўвагі да дысертацыі**

Станоўчая ацэнка дысертацыі і выдатнае ўражанне ад даследавання тым не менш выклікае жаданне выказаць некаторыя заўвагі і прапановы:

– на наш погляд, крыніцы патрабавалі большай увагі даследчыка (у дысертацыі – с. 25–29). Пры гэтым бачыцца, што больш выніковым аналіз крыніц мог стаць па тым пераліку, які вызначаны дысертантам на пачатку раздзела: "заканадаўчыя акты, справаводчая дакументацыя дзяржаўных, партыйных і камсамольскіх, іншых грамадскіх цэнтральных і рэгіянальных арганізацый, статыстычныя даведнікі, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, перыядычны друк, дакументы асабістага паходжання";

– улічваючы шматаспектнасць і спрэчнасць самой катэгорыі "моладзь" у розныя перыяды нашай гісторыі, яе канкрэтызацыя садзейнічала б лепшаму разуменню працэсаў, у якіх моладзь была задзейнічана. Акрамя таго, такое вызначэнне дазволіла б акрэсліць у адносных паказчыках сацыяльна актыўную частку моладзі, яе дэмаграфічныя характарыстыкі і ступень уплывовасці ў грамадстве;

– пры характарыстыцы ідэйна-палітычнай работы была б цікавай інфармацыя аб ўзроўні адукацыі тых, хто ў гэтай працы ўдзельнічаў, а таксама дынаміка гэтага працэсу;

– на наш погляд, прычыны недастатковай эфектыўнасці антырэлігійнай барацьбы ў 1920-я гг. выяўляліся і ў тым, што камсамолам не былі выпрацаваны ў гэты час прывабныя маральныя каштоўнасці, якія б прываблівалі перш за ўсё сельскую моладзь;

– у дысертацыі неаднаразова аўтар сведчыць аб "значных кампаніях" па таму, ці іншаму накірунку (с.226, 227, 228, 229). Мяркую,

што гэты тэрмін патрабуе тлумачэння, як і выніковасць такога віду сацыяльнай дзейнасці.

– у мізэрнай колькасці ў дысертацыі ёсць памылкі друку (с.10, 11). Пры гэтым некаторыя з іх, якія маюцца ў аўтарэфераце (с.29), у дысертацыі адсутнічаюць.

**Заключэнне**

Выказаныя заўвагі і прапановы носяць дыскусійны характар і не ўплываюць на агульную выдатную ацэнку даследавання. Лічу, што дысертацыя Вячаслава Віктаравіча Даніловіча "Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)" утрымлівае новыя навукова абгрунтаваныя вынікі і адпавядае пп. 19-20 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і званняў у Рэспубліцы Беларусь". Яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці "07. 00. 02 – айчынная гісторыя" за:

– вызначэнне і абгрунтаванне перыядаў станаўлення і развіцця камсамольскай арганізацыі Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. (1921–1923 гг. – арганізацыйнае станаўленне камсамола; 1924–1927 гг. – рост аўтарытэта камсамола ў грамадстве і заснаванне трывалай структуры камсамольскіх арганізацый ва ўсіх раёнах БССР; 1928–1933 гг. – арганізацыйны крызіс у ЛКСМБ і скарачэнне колькаснага складу маладзёжнага саюза; 1934–1939 гг. – умацаванне дысцыпліны і статутных нормаў, хуткі рост колькасці членаў ЛКСМБ).

– раскрыццё зместу (арыентацыя на ўмацаванне традыцыйных нацыянальна-культурных каштоўнасцей у маладога пакалення) і форм дзейнасці нацыянальных маладзёжных арганізацый (правядзенне вечарын, сходаў, акцый, выданне і распаўсюджванне агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры);

– вызначэнне і абгрунтаванне перыядаў развіцця ідэйна-палітычнай асветы моладзі і адпаведнай працы камсамола ў гэтым накірунку (1921–

1923 гг. – станаўленне сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы ў форме палітгурткоў і палітшкол; 1924–1928 гг. – пaступальнае развіццё формаў арганізацыйна-выхаваўчай работы; 1929–1935 гг. – крызісныя з’явы ў станаўленні ідэйна-палітычнай асветы моладзі; 1936–1939 гг. – фарміраванне разгалінаванай сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы ў БССР);

– вызначэнне тэндэнцый удзелу камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзейнасці дзяржаўных органаў улады і кіравання (павелічэнне колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання; стварэнне перадумоў, неабходных для забеспячэння шырокай падтрымкі ўлады; удзел ва ўнутрыпалітычнай барацьбе), а таксама форм удзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці ў 1921–1939 гг. (удзел у рабоце прафсаюзаў, праца сярод студэнцтва і ў кааператывах, пераўтварэнне ЛКСМБ у галоўную арганізуючую сілу грамадска-палітычнага жыцця моладзі БССР);

– раскрыццё форм удзелу, дасягненняў і недахопаў у дзейнасці камсамольскіх арганізацый і несаюзнай моладзі па мадэрнізацыі эканомікі краіны (абарона сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і правоў маладога пакалення, сацыялістычнае спаборніцтва, найперш удзел у стаханаўскім руху; барацьба з асацыяльнымі з’явамі ў маладзёжным асяроддзі, удзел у калектывізацыі сельскай гаспадаркі і наяўнасць супрацьлеглых падыходаў у адносінах да яе ажыццяўлення);

– выяўленне форм ўдзелу камсамольскіх арганізацый і несаюзнай моладзі ў працэсе станаўлення і развіцця сістэмы адукацыі (стварэнне школ рабочай і сялянскай (калгаснай) моладзі, удзел у дзейнасці устаноў вячэрняй адукацыі і пачатковай прафесійнай асветы);

– абгрунтаванне ролі камсамольцаў як рухавіка карэнных зменаў у галіне культурнага будаўніцтва і вызначэнне асноўных перыядаў удзелу моладзі ў культурным будаўніцтве (1921–1924 гг. – станаўленне нацыянальна-культурных гурткоў; 1925–1928 гг. – актывізацыя ўдзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР; 1929–

1934 гг. – спад удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве з прычыны ўзмацнення барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам; 1935–1939 гг. – ажыўленне і актывізацыя нацыянальна-культурнай працы на аснове ідэі пралетарскага інтэрнацыяналізма і дружбы народаў СССР).

Афіцыйны апанент:
загадчык кафедры крыніцазнаўства БДУ
доктар гістарычных навук, прафесар С. М. Ходзін

16 чэрвеня 2023 г.

ПОДПИСЬ Ходзіна С.М. УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления организационной работы и документационного обеспечения
Н.В. Черкасская
«16» 06 2023

З водгукам азнаёмлены.
В.В. Данілович
20.06.2023 г.